# Сціплай мовай праўды

Тамара КРУЧЭНКА

*Міхась Пятровіч Даніленка... Чытачы нашай газеты добра знаёмы з творчасцю пісьменніка, які 30 гадоў свайго жыцця адпрацаваў у "Гомельскай праўдзе". Яго рабочы кабінет і сапраўды, як зазначыў драматург Васіль Ткачоў, быў своеасаблівым "літаратурным інстытутам": празаік падтрымаў многіх пачынаючых аўтараў, застаўся для іх аўтарытэтным дарадцам на ўсё жыццё.*

*І сёння Міхась Пятровіч не парывае сувязі з роднай газетай, дасылае свае замалёўкі з натуры, апавяданні. У рэдакцыйным архіве шмат асабістых лістоў М. П. Даніленкі, адрасаваных супрацоўнікам рэдакцыі. Зваротны іх адрас — вёска Багатая Града Лоеўскага раёна. Менавіта сюды з ранняй вясны да позняй восені з'язджае пісьменнік на дачу і піша свае новыя творы.*

*У часопісе "Полымя" прачытала два новыя апавяданні Міхася Пятровіча — "Лівень" і "Пад варшаўскімі клёнамі". Ад душы парадавалася за цудоўную творчую форму празаіка, вернасць яго сваёй сціплай, праўдзівай манеры пісьма. Сюжэты пісьменнік чэрпае з жыцця, якое ведае не па кнігах: 19-гадовым юнаком трапіў на Паўднёва-Заходні фронт, у маі 1942-га на украінскай станцыі Мікалаеўка быў кантужаны, перажыў палон, здолеў уцячы. У пасляваенныя гады настаўнічаў у Казярожскай сямігадовай школе на Лоеўшчыне, завочна скончыў педагагічны інстытут. І пісаў свае творы, актыўна друкаваўся, выдаў больш 15 кніг. З 1950 года Міхась Пятровіч з'яўляецца членам пісьменніцкага творчага саюза.*

*Апошнім часам празаік імкнецца паказаць сённяшнюю рэчаіснасць праз прызму ўспрымання свайго пакалення.*

*У асобе Марціна Іванавіча Стрыжака з новых апавяданняў згадваем самога Даніленку, бачым прыкметы Любенскага мікраараёна нашага Гомеля. Пазнаваемы гэты куток абласнога цэнтра і ў гумарэсцы, якую мы друкуем.*

*Ад душы радуемся, што і сёлетняе лета празаіка на Лоеўшчыне шчодрае на творчыя набыткі. Так трымаць, Міхась Пятровіч!*